Падтрымай "Вясну" на PATREON

За Дзень волі суды працягваюцца сёння (абнаўляецца)

05.05.2016 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў



Дзень Волі, 25 сакавіка.

Суд Савецкага раёна Мінска 5 траўня працягне разгляд адміністрацыйных спраў па пратаколах, складзеных на ўдзельнікаў дазволенага ўладамі мерапрыемства – шэсця і мітынгу 25 сакавіка, прысвечаным Дню волі.

У 11-00 суддзя **М. Фёдарава** разгледзела справу актывіста **Паўла Сяргея.**

Павел Сяргей на суд не з'явіўся. Суддзя разглядаў адразу два пратаколы правапарушэнняў. Пратакол ад 7 красавіка складзены за пікет на Камароўскім рынку супраць мясной індустрыі.
Сведка **Рахманько** паведаміў, што пікетаванне не было дазволена. Сяргея пазнаў па фота, бо той быў без маскі. Сведка **Селіванаў** бачыў людзей ў масках і з плакатамі. Пытаўся, што яны робяць, а яны яго ігнаравалі. Паведаміў ахране і тая вывела дэманстрантаў.
У матэрыялах справы - рапарт за 28 сакавіка, што на сайце "Хартыя 97" ёсць інфармацыя пра пікетаванне. Ён раздрукоўка з сайта і фоты з акцыі.

Суддзя разглядзела таксама пратакол, складзены за 25 сакавіка. Сведка **Паўлоўскі Віталій** распавёў, якім чынам, згодна дазволу Мінгарвыканкама, павінена была праходзіць акцыя. Сам сведка быў ў грамадзянскай вопратцы, здымаў на камеру, потым праглядзеў запіс і пабачыў як Сяргей выкарыстоўваў мегафон і праводзіў мітынг.

Суддзя Фёдарава вынесла пастанову пакараць Паўла Сяргея штрафам у памеры 40 базавых велічынь

Суддзя **Наталля Драчова** разглядае адміністрацыйныя справы **Наталлі Саматыя** (11-00), **Рыгора Костусева** (11-30) і **Вячаслава Касінерава** (12-00).

Касінераў на суд таксама не з'явіўся, яму даслана павестка ў суд. Разгляд справы пачаўся без яго.Сведка Моўчан 25 сакавіка бачыў, як людзі сабраліся, але пасля дазволенага часу не сышлі ад кінатэатра “Кастрычнік», чым парушылі ўмовы дазволу і пачалі выкрываць лёзунгі. Моўчан склаў рапарт, пасля таго як устанавілі асобу Касінерава, пасля прагляду відэа.
28 красавіка Суд Савецкага раёна вынес пастановы ў дачыненні да 11 ўдзельнікаў Дня волі і пакараў іх грашовымі штрафамі ў памеры ад 20 да 50 базавых велічынь.

Яшчэ раней за ўдзел у Дні волі былі аштрафаваныя палітыкі Уладзімір Някляеў і Анатоль Лябедзька - па 50 базавых велічыняў кожны.

Твитнуть









"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

Чатырох жыхароў Паставаў асудзілі да "хатняй хіміі" за фотаздымак з Маршу (дапоўнена)

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 20 палітычных зняволеных

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класкоўская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17



ГАЛОЎНАЕ

"Я, напэўна, проста памру тут": хто з палітвязняў знаходзіцца ў асаблівай рызыцы за кратамі







АПОШНІЯ НАВІНЫ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

Валерыя Цапкалу завочна асудзілі да 17 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму (дапоўнена)

Запрашаем на прэзентацыю дакладу “Абмежаванне свабоды выказвання меркаванняў пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам” у Вільні

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі тэрмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі

Да пяці гадоў калоніі. Асудзілі палітвязняў, якія вывесілі нацыянальныя сцягі Беларусі і Украіны

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023







ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

СЯБРОЎСТВА

ENEMO

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY